ўтвараюць асобны фонд 1757 «Дзісненскі магістрат». Мной былі распрацаваны чатыры кнігі з гэтага фонду, якія ахопліваюць перыяд за 1696–1741 гг. [6, 7, 8, 9]. У іх утрымліваюцца звесткі пра склад магістрату, разглядаемыя на яго паседжаннях справы, выракі магістрацкіх судоў, дакументы, якія падаваліся ў магістрат для зацвярджэння (напрыклад, тэстаменты, купчыя, арэнды), звесткі па генеалогіі, гісторыі паперы, палеаграфіі і іншых спецыяльных гістарычных дысцыплінах. Гэта важная крыніца перш за ўсё для лакальнай гісторыі, але значэнне гэтых крыніц цяжка пераацаніць для гісторыі ўсёй краіны.

Калі падвесці вынікі да ўсяго вышэйадзначанага, то можна выдзеліць наступнае: горад Дзісна адносіўся да сярэдніх гарадоў, што праявілася і ў дзейнасці магістрату (ён з'яўляўся прамежкавым паміж магістратамі буйных і дробных гарадоў); магістрат фарміраваўся з прадстаўнікоў багацейшых сем'яў, якія ледзь не перадавалі ўрады ў спадчыну; захаваліся крыніцы па гісторыі дзейнасці дзісненскага магістрату – актавыя кнігі, з якіх можна атрымаць шмат інфармацыі пра разнастайныя аспекты жыцця горада Дзісны ў XVIII ст.

### Літаратура


1. *Hedemann O.* Dzisna i Druja: magdeburskie miasta. Wilno, 1934.
2. Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 51 (1566–1574) / Lietuvos istorijos institutas. Vilnius, 2000.
3. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Санкт-Петербургской археографической комиссией. / Под ред. Н.И.Костомарова. Т.1 (1361–1598). СПб., 1863.
4. НГАБ, КМФ-18, спр. 152.
5. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. / Предисл. П. Гильтебрандта. Т. 4. Вильна, 1867.
6. НГАБ, ф. 1757, воп. 1, спр. 2.
7. НГАБ, ф. 1757, воп. 1, спр. 3.
8. НГАБ, ф. 1757, воп. 1, спр. 4.
9. НГАБ, ф. 1757, воп. 1, спр. 5.


## РЭСТЫТУЦЫЯ КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ. ГІСТАРЫЧНЫЯ І ПРАВАВЫЯ АСПЕКТЫ

**К. М. Дубіцкая**

Рэстытуцыя – форма матэрыяльнага аднаўлення нанесенай шкоды культурным каштоўнасцям у выніку неправамернага міжнароднага акта шляхам аднаўлення стану, які існаваў да яго здзяйснення. Адбываецца

рознымі шляхамі і ў розным выглядзе [1, с.114]. Кампенсатарная рэстытуцыя – від матэрыяльнай міжнародна-прававой адказнасці дзяржавы-агрэсара, прымяняецца ў выпадках, калі ажыццяўленне адказнасці дзяржавай у форме звычайнай рэстытуцыі немагчыма [2, с.56]. Дапушчаецца перадача па дамоўленасці такой жа або прыкладна роўнай маёмасці да кошту вывезенай [3, с.21]. Лічбавая рэстытуцыя – перадача візуальнага вобразу замест арыгінальнага аб'екта. Гэта вынік сумеснай працы музеяў, універсітэтаў і навукова-даследчых інстытутаў па стварэнні электроннай базы дадзеных па калекцыях, што дазваляе забяспечыць агульнадаступнасць культурнай спадчыны [4, с.38–42]. Адзін з праектаў ICOM – стварэнне віртуальнага музея Ахеменідаў. У выніку пяцігадовых даследаванняў віртуальны музей быў створаны ў верасні 2006 г. у Інтэрнэце [5, с.5].

Вайна стала часткай гісторыі чалавецтва. Адна з асноўных мэтаў вядзення вайны – узбагачэнне. За кошт разрабаваных краін мацнелі і ўзвышаліся пераможцы. Гэтай дзейнасцю вызначыўся яшчэ старажытны Рым, ведучы актыўную каланізатарскую палітыку ў эпоху свайго росквіту. У сярэднявеччы рабаванне палацаў і храмаў у захопленых краінах разглядалася як законнае права пераможцы. Так было ў 1527 г., калі войска Карла V абрабавала Рым, у гісторыю ўвайшло як «Sacco di Roma» [6 с.51–53]. Эпоха Асветы пераўтварыла збіральніцтва прадметаў мастацтва з асабістай справы ў частку дзяржаўнай палітыкі. Вялікая Французская рэвалюцыя ажыццявіла гэтую ідэю.

У 1791 годзе ў палацы Луўр быў заснаваны Нацыянальны музей Францыі. Яго аснову склалі канфіскаваныя калекцыі Людовіка XVI і прадметы мастацтва, што знаходзіліся ва ўласнасці царквы. Пазней там апынуліся мастацкія каштоўнасці з усёй Еўропы, акупаванай арміяй Напалеона. Гэта планамернае рабаванне нарадзіла рэстытуцыю. Пасля паразы Напалеона пад Ватэрлоо Венскім кангрэсам 1815г. было прынята рашэнне аб вяртанні з Луўра 2 тыс. мастацкіх прадметаў папярэднім уладальнікам. Але дзякуючы «дрэннай памяці» галоўнага схоўніка Луўра Д. Дэнона, які «забываўся» аб месцах знаходжання тых ці іншых прадметаў, не ўсе каштоўнасці былі вернутыя [7, с.54].

Выпадак паспяховай рэстытуцыі – вяртанне нацыянальнай святыні Венгрыі Кароны Іштвана І. У 1945 г. па загаду кіраўніка Венгрыі, апошняга паплечніка Гітлера Ферэнца Салашы, карону, дзяржаву, скіпетр і каранацыйную мантыю вывезлі і схавалі пад Зальцбургам. Аднак жаўнеры ЗША знайшлі сховішча. У 1965 годзе на патрабаванне Венгрыі вярнуць каштоўнасць паводле дамоваў аб рэстытуцыі амерыканскія ўлады адмовілі. Да 1978 года карона знаходзілася на

ваенна-паветранай базе Форт Нокс у ЗША. Перамовы далі вынік у лістападзе 1977 года, калі прэзідэнт ЗША Картэр прыняў рашэнне вярнуць Святую Карону і 5 студзеня 1978 г. карона Іштвана I вярнулася на зямлю Венгрыі [8, с.144–148]. Зараз Карону разам з іншымі каралеўскімі рэгаліямі можна паглядзець, калі наведаць будынак Парламента ў Будапешце [9, с.14–17].

Так, на міжнародным узроўні ахова культурных каштоўнасцей ажыццяўляецца на аснове агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права. Асаблівае месца тут займае інстытут вяртання і рэстытуцыі культурных каштоўнасцей краінам, з якіх яны паходзяць. Гаворка ідзе аб вяртанні страчаных і незаконна вывезеных культурных каштоўнасцей краінам, якія з'яўляюцца іх законнымі ўладальніцамі. Адны з першых міжнародных дакументаў, важных для механізма рэстытуцыі культурных каштоўнасцей – Гаагскія канвенцыі 1907 і 1954 гадоў. Істотнае значэнне мае Канвенцыя ЮНЭСКА «Аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны» 1972 г. Аднак гэтыя дакументы не вырашылі праблем, што тычацца рэстытуцыі: вяртанне каштоўнасцей краінам паходжання, якія атрымалі незалежнасць; распрацоўка інстытута адказнасці дзяржаваў за страты, што былі прычынены культурнай спадчыне іншых народаў і інш. Гэта з'яўляецца асноўнай прычынай прыняцця Канвенцыі ЮНІДРУА па скрадзеных або незаконна вывезеных культурных каштоўнасцях Дыпламатычнай канферэнцыяй, якая праходзіла ў Рыме з 7 па 24 чэрвеня 1995 года [10, с.57–59]. Неабходна адзначыць важную дэталь: прваадносіны па рэстытуцыі культурных каштоўнасцей ўзнікаюць паміж дзяржавамі і рэгулююцца нормамі міжнароднага публічнага права, а не ўнутраным правам дзяржавы, на тэрыторыі якой выяўлена маёмасць. Толькі дзяржава, якая прадстаўлена ўрадам, мае паўнамоцтвы на прад'яўленне прэтэнзіі аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцей, вывезеных з яе тэрыторыі. Прайшоў час, прынятыя дакументы патрабуць карэктыроўкі і ўдасканалення, бо не ўяўляюць сабой завершанай міжнароднай нарматыўна-прававой сістэмы. Заключэнне і выкананне міждзяржаўных пагадненняў на прадмет вяртання каштоўнасцяў можа мець месца толькі са згоды абодвух бакоў. Рэальная рэстытуцыя – працэс непрымусовы, кожны выпадак вяртання каштоўнасці – па сутнасці акт добрай волі [11, с.91–113]. Стымулам вяртання могуць і павінны быць маральныя фактары. Прытрымлівацца этычных нормаў пры рэалізацыі міжнароднага права ды ўвесь час нагадваць пра маральныя забавязанні надзвычай важна.

Нормам міжнароднага права карэліруюць палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з якімі кожны мае права на ўдзел у

культурным жыцці, што забаспечваецца агульнадасягальнасцю каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры (Арт. 51). Абвешчаная агульнадасягальнасць абмежаваная незаконным знаходжаннем шматлікіх прадметаў беларускай культуры на тэрыторыях іншых дзяржаваў. Праца па выяўленню айчынных архіўных, музейных і бібліятэчных збораў па-за межамі Беларусі, распачалася ў канцы 1920-х гг. Патрабаваў вяртання ў межы беларускай дзяржавы вывезеных скарбаў Інстытут беларускай культуры. Пасля кароткага перыяду прафесійнага зацікаўлення вывезенымі каштоўнасцямі толькі ў кастрычніку 1987 г. пры Беларускім фондзе культуры з мэтай арганізацыі працы па вяртанню ў краіну гісторыка-культурных каштоўнасцей была створана камісія «Вяртанне». Нязменным старшынём камісіі да гэтага часу з'яўляецца А.І. Мальдзіс.

Рэспубліка Беларусь да гэтага часу не мае свайго закона аб рэстытуцыі. Адзін з крокаў па стварэнні дадзенага заканадаўства зрабіў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь пастановай ад 16 студзеня 2009 г. №43 «Аб Камісіі пры Савеце Міністраў РБ па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі» [12]. Задача Камісіі – вызначэнне прыярытэтных напрамкаў дзейнасці па вяртанню, выкарыстанню і ўвядзенню ў навукова-культурны ўжытак каштоўнасцей, выпрацоўка рэкамендацый па азначанаму комплексу пытанняў. Пры камісіі створана экспертная група, якая збірае і вывучае інфармацыю, ацэньвае прыналежнасць каштоўнасцей да Рэспублікі Беларусь, рыхтуе прапановы аб пытаннях выяўлення, вяртання і выкарыстання каштоўнасцей. Складаецца з прадстаўнікоў БДУ. Далейшае вырашэнне праблемы рэстытуцыі патрабуе актывізацыі дзейнасці ўсіх зацікаўленых дзяржаў і іх органаў у пошуках новых форм вяртання культурных каштоўнасцей, распрацоўцы механізмаў, якія б забяспечвалі рэальнае іх вяртанне дзяржавамі паходжання.

Аднаму з ідэолагаў нацызму, саратніку Гітлера, Альфрэду Розенбергу належыць выказванне: «Дастаткова знішчыць помнікі народа, каб ужо ў другім пакаленні ён перастаў адчуваць сябе нацыяй». Гэтыя словы – праекцыя сітуацыі, у якой апынулася Беларусь праз рабаванне яе нацыянальных каштоўнасцей на працягу стагоддзяў. Сёння Беларусі неабходна мець Закон аб рэстытуцыі. Кожная краіна Еўропы і СНД маюць такі закон у той ці іншай фармулёўцы. Яго наяўнасць з'яўляецца неабходнай умовай для ўступлення ў Еўрапейскі Саюз. Вывучэнне гісторыі і практыкі вяртання каштоўнасцей юрыстамі, гісторыкамі, мастацтвазнаўцамі, музееведамі, дыпламатамі і іншымі спецыялістамі

дазволіць стварыць дасканалае заканадаўства ў галіне рэстытуцыі. Вывучэнне заканадаўства іншых краін дапаможа выявіць яго хібы і недахопы, улічыць усе наступствы і пазбегнуць памылак пры стварэнні ўласнай заканадаўчай базы.

Неабходна памятаць аб тым, што ад стану культурных каштоўнасцей, якія складаюць нацыянальнае багацце дзяржавы, залежыць духоўнае развіццё і будучыня народа Беларусі.

## Літаратура


1. Юридический словарь. Авт.-сост. А. Азрилян, О. Азрилян. М., 2007.
2. *Ефремова Т. Ф.* Современный толковый словарь русского языка. // В III тт. М., 1996. Т. II.
3. Терминология проблем реституции // Вяртанне-3. Мн., 1996.
4. *Cummins Alissandra.* Universal Heritage Museum Partnerships // ICOM News. 2007. №1.
5. *Бриан Пьер.* Виртуальный и интерактивный музей Ахеменидов // Новости ИКОМ. 2006. №4.
6. *Judith Hook, Patrick Collinson.* The Sack of Rome. Palgrave Macmillan, 2004.
7. *Грицкевич В. П., Гужаловский А. А.* История музеев мира. Мн., 2003.
8. *Богуславский М. М.* Культурные ценности в международном обороте: правовые аспекты. М., 2005.
9. *Косьян Г. Н.* Мистической цепи звено. Реликвии венгерских королей // Антик Инфо. 2004. №4.
10. *Барчукова Н. К.* Конвенция ЮНИДРУА по похищенным или незаконно вывезенным культурным ценностям // Московский журнал международного права. 1996. №2.
11. *Ковальски В.* Репатриация культурных ценностей в ситуации уступок территории и распада многонациональных государств // Вяртанне-4. Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і суменснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты). Мн., 1997.
12. Пастанова Савета Міністраў РБ ад 16.01.2009 г. № 43 «Аб Камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі».


# ГРАМАДСКІЯ ЎЗАЕМААДНОСІНЫ Ў АСЯРОДКУ СЯЛЯНСКАЙ АБШЧЫНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТАГОДДЗЯ – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ


**Н. М. Карбалевіч**


Грамадская культура любога народа – гэта агромністы камунікатыўны досвед. Вывучэнне грамадскай культуры беларускага народа з’яўляецца актуальным у сучасным грамадстве, дзе з-за прымянення ўсё больш і